РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

ЗВЯЗДА

10 СТУДЗЕНЯ 2025 г. ПЯТНІЦА № 5 (30393)

2025-Ы — ГОД ДОБРАЎПАРАДКАВАННЯ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ нумар 1, якім 2025-ы аб'яўлены Годам добраўпарадкавання, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Гэты год дае старт пяцігодцы якасці і прадугледжвае комплекс мерапрыемстваў, накіраваных на стварэнне і падтрыманне зручнага, бяспечнага, сучаснага і эстэтычна арганізаванага асяроддзя жыццядзейнасці людзей. Рэалізоўваць гэтыя мерапрыемствы дзяржава будзе сумесна з арганізацыямі і грамадзянамі.

У 2025 годзе будуць прыняты маштабныя меры, у тым ліку па навядзенні парадку на зямлі, добраўпарадкаванні населеных пунктаў, вытворчых аб'ектаў, падтрыманні ў належным стане тэрыторый уздоўж аўтамабільных дарог і чыгунак. Адбудзецца не менш як два рэспубліканскія суботнікі.

Ураду даручана ў месячны тэрмін зацвердзіць рэспубліканскі план мерапрыемстваў Года добраўпарадкавання.

Указ прадугледжвае актывізацыю валанцёрскага руху і рэалізацыю грамадзянскіх ініцыятыў, накіраваных на добраўпарадкаванне краіны.

Год добраўпарадкавання закліканы аб'яднаць намаганні дзяржавы і грамадства па далейшым паляпшэнні якасці жыцця ў Рэспубліцы Беларусь.

ПЕНСІЁННЫЯ НАВАЦЫІ

З гэтага года спрашчаецца парадак прызначэння і выплаты пенсіі

Запрацавалі пенсіённыя навацыі, прадугледжаныя Указам Прэзідэнта «Аб сацыяльнай падтрымцы». Адно з самых чаканых новаўвядзенняў — зняцце абмежаванняў памеру пенсій для працоўных пенсіянераў. Яно закране больш за 100 тысяч чалавек, якія да гэтага года атрымлівалі пенсію ў меншым памеры. Са студзеня іх даходы павялічацца — у некаторых да 500 рублёў. Прычым пералік праводзіцца аўтаматычна, таму дадаткова звяртацца ў органы па працы і сацыяльнай абароне не трэба.

ДЛЯ ПРАЦОЎНЫХ — У ПОЎНЫМ ПАМЕРЫ

Нагадаем, адпаведны ўказ падпісаны кіраўніком дзяржавы 29 кастрычніка мінулага года.

— Гэта адзін з самых комплексных дакументаў па пытаннях пенсіённага забеспячэння, прынятых у бягучай пяцігодцы. Ён накіраваны на павышэнне ўзроўню пенсіённага забеспячэння асобных катэгорый, на спрашчэнне парадку прызначэння і выплаты пенсій, а таксама на аказанне мер сацыяльнай падтрымкі дзецям-інвалідам, шматдзетным маці, — адзначае **начальнік галоўнага ўпраўлення пенсіённага забеспячэння Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Алена ГОМАРАВА.**

Яна паведаміла, што ў краіне працуюць каля 450 тысяч пенсіянераў. З іх чвэрць, — людзі, якія да дасягнення пенсіённага ўзросту мелі больш высокую заработную плату (130 % і больш ад сярэдняй па краіне) і адпаведна індывідуальны каэфіцыент вышэйшы за 1,3. Да 1 студзеня бягучага года яны атрымлівалі пенсію з абмежаваннямі.

— Памер абмежавання ў кожнага быў свой. У залежнасці ад працягласці стажу і заработнай платы да дасягнення пенсіённага ўзросту ён складаў да 500 рублёў, — дадала Алена Гомарава. — З 1 студзеня гэтым людзям пенсія будзе выплачвацца без абмежавання. Калі пенсіянер працуе і ў яго індывідуальны каэфіцыент ніжэйшы за 1,3, то і да 1 студзеня ў перыяд работы ён атрымліваў пенсію ў поўным памеры, таму яна не зменіцца.

СТАР. 6

НЕ ХАДЗІЦЕ ПА ТОНКІМ ЛЁДЗЕ! 11

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

НАШЫ КАШТОЎНАСЦІ — КОД НАЦЫІ

Эксперты — аб глыбінных сэнсах у прамове Прэзідэнта на цырымоніі ўручэння прэмій «За духоўнае адраджэнне»

Пазаўчора ў зале Палаца Рэспублікі з удзелам кіраўніка краіны адбылася ўрачыстая цырымонія ўзнагароджання прэміямі «За духоўнае адраджэнне», спецыяльнымі прэміямі дзеячам культуры і мастацтва і спецыяльнымі прэміямі «Беларускі спартыўны Алімп». Сціслае, але ёмістае і моцнае выступленне Аляксандра Лукашэнкі, якое ахоплівае час цяперашні (з геапалітычнымі гульнямі навокал) і нашу будучыню (як далей жыць будзем), як кажуць, разляцелася на цытаты. Самыя цікавыя выказванні экспертаў, агучаныя ў медыяпрасторы, — у нашым матэрыяле.

СТАР. 2–3

ISSN 1990 — 763X

НАШЫ КАШТОЎНАСЦІ —

ГАЛОЎНЫ ВЫКЛІК — ЭКАНОМІКА

Наступны год
будзе няпростым.
Нам прыйдзецца напружвацца
ў два разы больш,
чым у мінулым годзе.
Але мы пераадолеем
усе цяжкасці.
І не таму, я хачу сказаць,
што мы адзіныя,
мы натхнёныя і гэтак далей.
Мы навучыліся працаваць
у цяжкіх умовах,
калі нас ціснуць
з усіх бакоў.

Фота БелТА.

Гэты тэзіс пацвярджае **міністр замежных спраў Максім РЫЖАНКОЎ**, які прывёў наступныя даныя ў часопісе «Экономика Беларуси»:

— Спробы ізаляваць нашу краіну пацярпелі фіяска і, запэўніваю вас, далей не будуць мець ніякага поспеху. Патокі экспарту на рынкі Захаду і Украіны, якія выпалі, ужо не проста кампенсаваны і пераарыентаваны, але і істотна перавышаны.

Паводле яго слоў, сумарна Беларусь прадаўжае гандляваць больш як з 210 краінамі і тэрыторыямі. У пяцёрку асноўных партнёраў уваходзяць Расія, Кітай, ААЭ, Польшча, Германія. Значныя аб'ёмы гандлю з Казахстанам, Турцыяй, Італіяй, Бразіліяй, Узбекістанам.

— Безумоўна, сур'ёзным выклікам для айчынных экспарцёраў сталі выбудоўванне лагістыкі для дастаўкі тавараў і перафарматаванне сістэмы трансгранічных плацяжоў. Але мы працуем па гэтых пытаннях, у тым ліку з партнёрамі з дружалюбных краін, і, як правіла, знаходзім эфектыўныя рашэнні. У 2023 годзе аб'ём узаемнага гандлю таварамі і паслугамі Беларусі і Расіі перавысіў рэкордны паказчык 53 мільярды долараў, — патлумачыў міністр і запэўніў: — Па выніках 2024-га чакаем новы рэкорд, што, безумоўна, не можа не радаваць. Дынамічна развіваецца наша ўзаемадзеянне і з астатнімі традыцыйнымі партнёрамі па ЕАЭС і СНД, а таксама з Грузіяй. Прырост экспарту ў гэтыя краіны дасягнуў практычна чвэрці ад паказчыкаў 2023 года.

Максім Рыжанкоў адзначыў таксама: не спыняецца планамерная работа з іншымі партнёрамі, сярод якіх і краіны далёкай дугі — Індыя, В'етнам, Аб'яднаныя Арабскія Эміраты і іншыя. Асобнае месца займае Кітай.

— Скажу адкрыта: доля гэтых краін у нашым экспарце пакуль не такая вялікая, як магла б быць. Але дынаміка росту станоўчая — з 11 % у 2021 годзе да 20 % — у 2024-м. А наша стратэгічная мэта — 30 %. Сур'ёзна працуем над яе дасягненнем.

Акрамя таго, падкрэсліў міністр, нягледзячы на спробы палітычнага кіраўніцтва ЕС і ЗША адкрыта прыціскаць свой бізнес, звязаны з Беларуссю, там таксама захоўваецца сур'ёзны інтарэс да гандлёвага і інвестыцыйнага супрацоўніцтва.

— Прадаўжаем працаваць у не закрытых санкцыямі сектарах, у тым ліку нарошчваць экспарт у ЕС. Гэта аб многім сведчыць, і разумныя, разважлівыя людзі даўно зрабілі высновы, — акцэнтаваў увагу ён.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

ПАДМУРАК МОЦНАЙ, НЕЗАЛЕЖНАЙ ДЗЯРЖАВЫ

Ісціна простая: у аснове любой чалавечай дзейнасці ляжаць духоўнасць і маральнасць (як я часта кажу, справядлівасць) — жыватворны эліксір для культуры, трывалай сувязі пакаленняў і традыцый. Яны — аснова адзінства нацыі, якая ведае сваю гісторыю, шануе спадчыну продкаў і клапоціцца пра будучыню. Аснова таго, што вызначае характар народа. Духоўнасць і маральнасць — падмурак моцнай, незалежнай дзяржавы.

У аснову прэміі «За духоўнае адраджэнне» лёг прынцып міжканфесійнага міру — за 27 гадоў лаўрэатамі былі прадстаўнікі як праваслаўнай, так і каталіцкай царквы. Гэта пацвярджае, што ў адзінстве наша духоўная сіла. Такое меркаванне выказаў sb.by **член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Віктар АЗАРОНАК.**

Ён падкрэсліў, што прэмія «За духоўнае адраджэнне» была заснавана кіраўніком дзяржавы ў 1997 годзе для таго, каб зберагчы і перадаць новым пакаленням традыцыйную хрысціянскую мараль, маральнасць і багатую культуру Беларусі:

— Сёння, калі мы са шкадаваннем назіраем за тым, як імкліва руйнуюцца каштоўнасці не толькі ў краінах Захаду, але і ў нашых найбліжэйшых суседзяў — украінцаў, — мы як ніколі разумеем: наша нацыянальная спадчына павінна быць захавана і прымножана.

Ён перакананы, што прысуджэнне прэміі прымеркавана да святкавання Раждаства Хрыстовага, і што невыпадкова:

— Гэтае свята — урачыстасць духоўнага адраджэння. Мы глыбока шануем праваслаўную царкву, якая на працягу многіх стагоддзяў уносіць вялікі ўклад у захаванне і ўмацаванне адзінства беларускага народа, падтрыманне міру і грамадзянскай згоды на нашай зямлі. Аднак мы ніколі не дзялілі людзей на сваіх і чужых у залежнасці ад іх рэлігіі, нацыянальнасці, перакананняў. Мы заўсёды выступалі за сяброўства і братэрства паміж імі.

Парламентарый падкрэсліў: штогод кіраўнік дзяржавы ўручае высокую ўзнагароду прадстаўнікам самых розных прафесій: святарам, супрацоўнікам дабрачынных арганізацый, педагогам, медыкам, людзям творчых прафесій і ўсім, хто паказвае прыклад сапраўднага патрыятызму, натхняе нас сваімі талентамі і поспехамі.

— Радуе, што, нягледзячы на тое, што адбываецца вакол, цікавасць беларусаў да сваёй культуры, традыцый, гісторыі з кожным годам расце. Мы ўсведамляем: нашы каштоўнасці — код нашай нацыі, — лічыць Віктар Азаронак. — Мы разумеем гэта самі і імкнёмся данесці гэта да нашых дзяцей, бо відавочна, што патрыятызм і духоўнасць — паняцці непадзельныя. Усё найлепшае, што ёсць у нашым жыцці, пачынаецца з любові — да родных і блізкіх, да малой радзімы, да сваёй Айчыны. Менавіта яны натхняюць нас на служэнне сапраўды высакародным мэтам. Беларусам ёсць чым ганарыцца — і мы ганарымся.

ФУНДАМЕНТАЛЬНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ ПАДЗЯЛЯЕ АБСАЛЮТНАЯ БОЛЬШАСЦЬ БЕЛАРУСАЎ

Яшчэ адзін важны пасыл ад Прэзідэнта, у якім закладзены і гонар за беларусаў, і фундаментальнае бачанне шляху, па якім ідзём.

Ігар МАРЗАЛЮК, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, навуцы і культуры, адзначае, што духоўнасць і маральнасць, тоесныя справядлівасці, — гэта фундаментальныя каштоўнасці, якія сапраўды вызначаюць наш цывілізацыйны, дзяржаўніцкі код.

«Беларусь — гэта хрысціянская традыцыя, хрысціянская культура. Менавіта гэта складае стрыжань беларускага нацыянальнага характару і беларускай чалавечнасці. А свецкая праекцыя фундаментальных бессмяротных хрысціянскіх каштоўнасцяў адлюстравана ў Асноўным Законе нашай краіны — Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

Фундаментальныя каштоўнасці, якія падзяляе абсалютная большасць беларусаў, прадвызначаны нашым цывілізацыйным выбарам яшчэ ў часы Полацкага і Тураўскага княстваў. І гэтыя рэчы застаюц-

КОД НАЦЫІ

ца альфай і амегай для кожнага беларуса і аб'ядноўваюць нас у адзінае цэлае з народамі і культурамі, якія з'яўляюцца нашымі духоўнымі пабрацімамі. У першую чаргу гэта тычыцца народаў гістарычнай Русі: беларусаў, рускіх і ўкраінцаў. Пра гэта таксама неаднаразова казаў Прэзідэнт, які выдатна разумее сутнасць ментальнасці народа, яго прыхільнасць да справядлівасці і захавання спрадвечных каштоўнасцяў. Беларусы заўсёды жылі з разуменнем таго, што базавай матрыцай нашай нацыі з'яўляецца поўная сям'я, з тым, што мы народ пераможцаў, а не паліцаяў. Усё гэта складае аснову нашай незалежнасці, нашага існавання, якая закладзена ў Канстытуцыі, адлюстравана ў нашых законах, у нашых акцыях і ў нашых святах. Беларусь — гэта добрая Русь, краіна добрых людзей і вялікіх хрысціянскіх сэнсаў. Гэта і ёсць наш беларускі лад жыцця, беларуская ідэалогія, тыя скрэпы, без якіх немагчыма беларуская дзяржаўнасць. Не была магчыма ўчора і немагчыма сёння», — адзначыў эксперт.

Фота БелТА.

ЗБЕРАЖОМ СВАЮ КРАІНУ

Як бы хтосьці ні імкнуўся нас сёння разгайдаць, нічога не атрымаецца. Нічога не атрымаецца! Мы зберажом сваю краіну. Мы ўсё зробім у наступнай пяцігодцы, каб наша краіна назаўжды забылася праблему захавання сваёй дзяржаўнасці.

Каментуючы заяву кіраўніка дзяржавы ў эфіры «Альфарадыё», **медыяэксперт Дзмітрый Швайба** адзначыў:

— Мяне вельмі ўразілі гэтыя словы. Шмат што лунае ў паветры. І Прэзідэнт ва ўласцівай яму манеры выкрывае праблему, не замоўчвае яе, не рэтушуе, кажа адкрыта: так, выклікі для беларускай дзяржаўнасці існуюць. Не хочацца называць тыя сілы, якія з задавальненнем бы падзялілі спадчыну беларускай незалежнасці. А гэта ж не толькі палітычны аспект, але і эканамічны. Захаваны каласальны маёмасны комплекс.

Дзяржава яго не толькі не разбазарыла, не страціла, але і прымножыла. І тое, што мы захавалі, з'яўляецца аб'ектам зацікаўленасці для вельмі многіх сіл.

Эксперт адзначыў, што беларуская дзяржаўнасць шчыльна звязана з захаваннем унікальнай культуры, унікальнай палітычнай супольнасці, унікальнага беларускага грамадства. Ён падкрэсліў:

— Мы павінны пераадолець тыя выклікі, якія фарміруюцца натуральным чынам, незалежна ад нашага жадання. Беларуская незалежнасць — тое самае галоўнае, што мы атрымалі, захавалі і абавязаны захаваць у будучыні. Фактычна гэта задача на найбліжэйшую і аддаленую будучыню.

Мы не маем права дапусціць стратэгічных памылак, якія могуць перашкодзіць нам прайсці гэты шлях. Менавіта пра гэта гаварыў кіраўнік дзяржавы. Думаю, вельмі многія гэта пачулі. Гэта фундаментальная фраза.

Дзмітрый Швайба звярнуў увагу і на тое, што Аляксандр Лукашэнка ўжо неаднойчы казаў, што 2025 год будзе нялёгкім:

— Па-першае, геапалітычная барацьба працягваецца, і працягваецца досыць жорстка. Барацьба за рэсурсы абвастраецца. У гэтым сэнсе задача санкцый, якія пад любымі падставамі ўводзяць супраць нас, супраць Саюзнай дзяржавы, супраць нашага асноўнага эканамічнага, палітычнага партнёра, — перарасперкаванне рэсурсаў не на нашу карысць, — падкрэсліў спікер.

Прэзідэнт Беларусі 8 студзеня таксама заявіў, што будучы год і ўся пяцігодка пройдуць пад лозунгам міру і бяспекі.

— Для нас бяспека — гэта саюзніцтва. Саюзніцтва з нашым асноўным стратэгічным партнёрам, апора на яго тэхналагічныя магчымасці. Гэта магчымасць вельмі хуткага рэагавання на выклікі, якія адбываюцца. І гэта вельмі выдатна выцвярэжвае нашых апанентаў. Чаго вартая, напрыклад, заява аб размяшчэнні ў Беларусі нашумелай зброі «Арэшнік». < ... > У нас ёсць гэты рычаг. У рамках саюзнага разумення бяспекі мы гаворым пра тое, што тэхналагічнае забеспячэнне адбываецца з дапамогай Расійскай Федэрацыі, але патэнцыяльныя мэты для астуджэння найбольш гарачых галоў выбірае палітычнае кіраўніцтва Беларусі. Гэта не таму, што мы хочам браздаць зброяй, на кагосьці нацэльвацца, па кімсьці страляць, але свет такі, які ён ёсць, — адзначыў Дзмітрый Швайба.

Фота БелТА.

АФІЦЫЙНА

УКЛАД У ЗАХАВАННЕ СПАДЧЫНЫ

З фонду Прэзідэнта Беларусі па падтрымцы культуры і мастацтва будзе выдзелена 6 мільёнаў рублёў на рэалізацыю культурна значных праектаў.

Адпаведнае распараджэнне «Аб падтрымцы культуры і мастацтва» падпісаў 8 студзеня кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

За кошт сродкаў фонду будзе аказана падтрымка аб'екту гісторыка-культурнай каштоўнасці міжнароднага значэння — Успенскаму сабору Свята-Успенскага манастыра ў Жыровічах — на рэстаўрацыю іканастаса. Трэба сказаць, што іканастас выраблены ў 1676 годзе. Яго абнаўленне і рэканструкцыя неаднаразова праводзіліся ў XIX—XX стагоддзях. Нацыянальны мастацкі музей Беларусі працягне работы па стварэнні комплексу будынкаў музея і адзінай выставачнай прасторы карпусоў па вул. Леніна, 22 і вул. Леніна, 20.

Як адзначылі ў прэс-службе Прэзідэнта, рэалізацыя праектаў унясе значны ўклад у захаванне і прымнажэнне культурнай спадчыны Беларусі.

ІСТОТНАЯ ПАДТРЫМКА МОЛАДЗІ

На заахвочванне адораных навучэнцаў і студэнтаў будзе выдзелена 680 тысяч рублёў, а на падтрымку таленавітай моладзі — больш за 90 тысяч рублёў.

З рэзервовага фонду Прэзідэнта Беларусі будзе выдзелена 680 тысяч рублёў на заахвочванне адораных навучэнцаў і студэнтаў, а таксама асоб, якія іх падрыхтавалі. Адпаведнае рашэнне спецфонду па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў зацверджана распараджэннем, якое падпісаў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка, паведамілі ў прэс-службе Прэзідэнта.

У адпаведнасці з дадзеным рашэннем прысуджана 26 гранд-прэмій з уручэннем нагруднага знака «Лаўрэат спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы насельніцтва і студэнтаў» і 217 спецыяльных прэмій пераможцам рэспубліканскіх алімпіяд і конкурсаў.

Узнагароджанне за асаблівы ўклад у развіццё здольнасцяў адораных навучэнцаў і студэнтаў атрымае 21 педагагічны работнік.

Акрамя таго, за выдатную вучобу, поспехі ў навукова-даследчай і творчай дзейнасці 173 студэнтам і курсантам устаноў вышэйшай адукацыі прызначана стыпендыя Прэзідэнта Беларусі.

У прэс-службе беларускага лідара дадалі, што распараджэнне накіравана на выяўленне і падтрымку найбольш матываванай і адоранай моладзі, стварэнне спрыяльных умоў для яе паспяховай вучобы, навуковай і творчай дзейнасці, стымуляванне прафесійнага росту педагогаў.

Акрамя таго, больш за 90 тысяч рублёў накіравана са спецыяльнага фонду Прэзідэнта Беларусі па падтрымцы таленавітай моладзі на выплату 23 спецыяльных прэмій і дзвюх гранд-прэмій.

Адпаведнае рашэнне Савета спецфонду зацверджана распараджэннем, якое падпісаў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка.

Заахвочваннямі фонду адзначаны калектыў «Лабараторыя эстраднага танца БДУКМ» і 24 прадстаўнікі таленавітай моладзі — пераможцы міжнародных і рэспубліканскіх конкурсаў і фестываляў у галіне музычнага, харэаграфічнага і іншых відаў мастацтваў.

Распараджэнне з'яўляецца сведчаннем увагі дзяржавы да стварэння ўмоў для развіцця і навучання таленавітай моладзі, стымулявання яе творчай актыўнасці і прафесійнага росту.

Наталля КАЧАНАВА:

«ЛЮДЗІ — САМАЕ ГАЛОЎНАЕ»

У Бараўлянах адкрылі новы сацыяльны цэнтр

У чацвер, 9 студзеня, жыхары прысталічнага рэгіёна атрымалі каштоўны падарунак. У вёсцы Бараўляны адкрылі новы будынак Тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Мінскага раёна. Ва ўрачыстай цырымоніі адкрыцця ўзялі ўдзел Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава і старшыня Мінскага аблвыканкама Аляксандр ТУРЧЫН.

Фота БелТА.

Сёння на ўліку ў гэтым цэнтры знаходзяцца каля 32,6 тысячы чалавек. Гэта інваліды I і II групы, адзінокія пажылыя грамадзяне, а таксама сем'і, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў. Плошча цэнтра — больш за пяць тысяч квадратных метраў. Абсталяваны ўсім неабходным, ён цалкам забяспечыць выкананне ўсіх патрэб наведвальнікаў. У цэнтры функцыянуюць аддзяленне першаснага прыёму, аналізу, інфармавання і прагназавання; аддзяленне сацыяльнай дапамогі дома; аддзяленне комплекснай падтрымкі ў крызіснай сітуацыі; аддзяленне сацыяльнай рэабілітацыі, абілітацыі інвалідаў; аддзяленні, якія забяспечваюць дзённае знаходжанне грамадзян пажылога ўзросту, і іншыя.

«Я вельмі рада сёння знаходзіцца тут. Мы ў Савеце Рэспублікі якраз абмяркоўвалі пытанні функцыянавання нашых тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, таму што працягласць жыцця ў нашай краіне павялічваецца, людзей пенсіённага ўзросту становіцца больш. Пажылыя людзі хочуць мець зносіны, хочуць сустракацца і прыносіць карысць для сваёй краіны, — звярнулася да прысутных Наталля Качанава. — На мой погляд, тут створаны ўсе ўмовы. І тут можна займацца тым, чым хочаш, дапамагаць тым, хто мае патрэбу».

Спікер Савета Рэспублікі звярнула ўвагу, што ў тэрытарыяльным цэнтры працуе вялікая колькасць моладзі: «І гэта выдатна, бо нашы каледжы выпускаюць добрых спецыялістаў. У тэрытарыяльным цэнтры сканцэнтраваны людзі больш старэйшага ўзросту і моладзь. А гэта — міласэрнасць, дабрыня, спагадлівасць. Тое, што нам сёння трэба».

Наталля Качанава выказала ўпэўненасць, што гэты цэнтр стане добрым месцам прыцягнення людзей, якія заслужылі свой адпачынак: «Прэзідэнт заўсёды нам кажа, што людзі — гэта самае галоўнае. Павінна быць справядлівае стаўленне да людзей».

На сустрэчы з працоўным калектывам Тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Мінскага раёна Наталля Качанава адзначыла, што тут створаны выдатныя ўмовы для працы: «Умовы проста цудоўныя, і ўсё ўлічана зыходзячы з тых нормаў і патрабаванняў, якія прад'яўляюцца такім установам. Работу службы сацыяльнай абароны мы разглядалі на выязным пасяджэнні Прэзідыума Савета Рэспублікі ў Дзяржынску. Там таксама пабудавалі добры цэнтр. Члены Савета Рэспублікі разумеюць і бачаць, наколькі важная работа з людзьмі сталага ўзросту, з тымі, якія маюць інваліднасць. І, вядома, кіраўнік дзяржавы ставіць задачу ўраду падцягваць зарплату работнікам сацыяльнай абароны, аховы здароўя. Гэта вельмі важна».

На сустрэчы гаварылі аб розным. У тым ліку на якую падтрымку могуць сёння разлічваць шматдзетныя сем'і і сем'і, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў, якія льготы ім прызначаны. Закранулі і дэмаграфічную праблему: падрастаючае пакаленне не спяшаецца ствараць сем'і, нараджаць дзяцей. Не апошнюю ўвагу ўдзялілі і эканамічным пытанням. Наталля Качанава запэўніла, што беларусы як не адчувалі на сабе санкцыі, так і не адчуюць у будучыні.

Па словах старшыні Мінскага аблвыканкама Аляксандра Турчына, сёння ў Мінскім раёне наганяюць тое, што трэба было зрабіць даўно: «За апошнія гады пабудавалі і сады, і школы, сёлета ўвядзём у эксплуатацыю фізкультурна-аздараўленчы комплекс з басейнам, спартыўнай залай. Гэта вялікія грошы».

Губернатар падкрэсліў, што ў Мінскай вобласці працаваць няпроста: «Тут жыве Прэзідэнт, і для нас гэта вялікая адказнасць. З іншага боку, ён ведае нашы праблемы і дапамагае, таму яшчэ адзін-два гады — і мы завершым будаўніцтва ўсіх сацыяльных аб'ектаў. Тут можна будзе жыць людзям усіх пакаленняў».

«З пераездам у новы будынак гатовыя ахапіць сацыяльнымі паслугамі адначасова 250 чалавек, прычым штодня, не губляючы ні хвіліны, — адзначыла **дырэктар установы Алена ЦІГАНІНА.** — Тут працуе шэсць аддзяленняў, у тым ліку адзінае ў вобласці аддзяленне забеспячэння дзённага знаходжання для маладых людзей з цяжкімі і множнымі парушэннямі развіцця». З 2023 года ТЦСАН рэалізоўвае праект «Унукі на парозе», добра зарэкамендаваў сябе праект «Прафесійны догляд дома». На базе цэнтра функцыянуюць інтэрактыўныя класы «Бяспека ў лесе» і «Бяспека ў побыце», аналагаў якім у краіне няма.

Як адзначыла **старшыня камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінскага аблвыканкама, член Савета Рэспублікі Тамара КРАСОЎСКАЯ,** ТЦСАН Мінскага раёна — самы буйны ў краіне, пабудаваны з нуля. У хуткім часе будзе завершана будаўніцтва новага тэрытарыяльнага цэнтра ў Стоўбцах. На чарзе — ТЦСАН у Смалявічах.

Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.

КАНСТРУКТЫЎНЫ ДЫЯЛОГ

У ПРЫЯРЫТЭЦЕ — ІНТАРЭСЫ КРАІНЫ

Аб чым Ігар СЕРГЯЕНКА гаварыў са студэнтамі факультэта транспартных камунікацый БНТУ

Мерапрыемства прайшло ў рамках праекта Палаты прадстаўнікоў «Моладзь для Беларусі!». Спікер праінфармаваў студэнтаў аб структуры і паўнамоцтвах Нацыянальнага сходу, расказаў аб заканадаўчай і міжнароднай дзейнасці дэпутацкага корпуса, рабоце ў выбарчых акругах. Старшыня Палаты прадстаўнікоў прывёў канкрэтныя прыклады, якія сведчаць аб магутным эканамічным патэнцыяле нашай краіны, сацыяльнай арыентаванасці дзяржаўнай палітыкі.

Фота БелТА.

«Сітуацыя ў нас стабільная»

Асобна Ігар Сергяенка спыніўся на дасягненнях суверэннай Беларусі. «Сёння мы пішам новую, чарговую главу нашай гісторыі, — падкрэсліў ён. — 26 студзеня пройдуць выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Усе з вас, каму ёсць 18 гадоў, будуць прымаць у іх удзел. Выбары — гэта важная грамадска-палітычная падзея. Выбар павінен быць усвядомлены, у імя будучыні нашай краіны, якую мы вызначаем і будуем самі, ставячы ў прыярытэт інтарэсы не асобнай часткі грамадства, а ў цэлым нашай краіны».

На фоне шэрагу дзяржаў, у тым ліку суседніх з намі, Беларусь развіваецца і стварае сваю будучыню пад мірным небам. «Сённяшняя сітуацыя ў нас стабільная, і цяперашняя выбарчая кампанія праходзіць у спакойнай, канструктыўнай абстаноўцы, — канстатаваў Старшыня Палаты прадстаўнікоў. — Але не варта забываць, што мы з вамі, па сутнасці, знаходзімся ўцягнутымі ў інфармацыйную вайну. Колькі ствараецца шматлікага роду фэйкаў, правакацый, пачынаючы ад паведамленняў, якія вымушаюць людзей паводзіць махлярам грошы, нягледзячы на работу, якая праводзіцца. На прыватным прыкладзе нейкага нядбайнага прадаўца або няякасна пастаўленага тавару, або аўталаўкі, якая недаехала ў канкрэтны населены пункт, можна паказаць, што гэта сістэмны недахоп, што гэта характэрна ў цэлым для краіны». У сувязі з гэтым спікер заклікаў маладых людзей адэкватна падыходзіць да ўспрыняцця інфармацыі, параіў атрымліваць інфармацыю з дзяржаўных СМІ — у прыватнасці, звяртацца да друкаванай прэсы.

Каля 300 мерапрыемстваў — у рамках праекта

Старшыня Палаты прадстаўнікоў звярнуў увагу на важнасць захавання гістарычнай памяці. Размова ішла аб подзвігу савецкага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Адразу ж у аўдыторыі, дзе праходзіла сустрэча, спікер прапанаваў паглядзець фрагмент з расійскай кінастужкі на ваенную тэму, пасля якой, напэўна, ні ў каго з маладых людзей не засталося сумнення ў тым, чаму мы ўсе павінны адстойваць праўду аб нашым гераічным і трагічным мінулым.

Студэнты адрасавалі Старшыні Палаты прадстаўнікоў пытанні. Хлопцы і дзяўчаты цікавіліся, ці варта ўкараняць у выбарчы працэс сучасныя тэхналогіі, што трэба рабіць для таго, каб людзі цанілі ўкладзеныя дзяржавай сродкі на рэканструкцыю і будаўніцтва дарог. Маладыя людзі выказалі прапанову наведваць з экскурсіямі Дом урада, дзе разам з Саветам Міністраў размяшчаецца Палата прадстаўнікоў. Агучвалі і асабістыя пытанні: моладзь цікавіла, ці падабалася ў свой час спікеру вучыцца ў ВНУ і ці карыстаецца ён сацсеткамі. Адным словам, атрымаўся шчыры дыялог, без закрытых тэм.

Вынікі сустрэчы Ігар Сергяенка падвёў у размове з журналістамі. Старшыня Палаты прадстаўнікоў адзначыў, што ў рамках праекта «Моладзь для Беларусі!» дэпутаты выступаюць у маладзёжных аўдыторыях, расказваюць аб сённяшнім дні нашай краіны, аб дасягненнях Беларусі за 30 гадоў прэзідэнцтва.

«Ён задумваўся як праект на базе канкрэтных факультэтаў вышэйшых навучальных устаноў, але зрабіў крок далёка за рамкі запланаванага, — заўважыў спікер. — Сёння дэпутаты ўжо правялі каля 300 мерапрыемстваў у розных навучальных аўдыторыях, маладзёжных калектывах, рэгіёнах, горадзе Мінску. Размаўляючы са студэнтамі БНТУ, канкрэтна факультэта транспартных камунікацый, я адчуў, што будучыня інжынеры жыва цікавяцца грамадска-палітычным жыццём нашай краіны. Гэтыя хлопцы і дзяўчаты літаральна заўтра-паслязаўтра прыйдуць у дарожныя арганізацыі і будуць на практыцы рэалізоўваць тыя задачы, якія паставіў кіраўнік дзяржавы ў Год добраўпарадкавання краіны».

Старшыня Палаты прадстаўнікоў звярнуў увагу на тое, што дарожнае будаўніцтва ў Беларусі інтэнсіўна развіваецца. «Цудоўныя магістралі звязваюць горад Мінск з абласнымі цэнтрамі, узмоцнена рамантуецца дарожная сетка ў раёнах, пастаўлена задача кіраўніком дзяржавы зрабіць дарогі паміж аграгарадкамі і раённымі цэнтрамі, — канкрэтызаваў ён. — І вось гэтыя хлопцы і дзяўчаты, якія сёння прысутнічаюць у аўдыторыі, гэтым будуць займацца».

Па словах студэнта 4 курса БНТУ Аляксандра МАЛАШКІ, веды, якія маладыя людзі атрымалі з вуснаў Старшыні Палаты прадстаўнікоў, ім абавязкова спатрэбяцца ў будучыні. «Такі фармат сустрэч актуальны: моладзь можа задаць пытанні, якія іх цікавяць, дасведчанай асобе і атрымаць разгорнуты, кампетэнтны адказ», — канкрэтызаваў ён.

Вераніка КАНЮТА.

УРАЖАННІ

«ГЭТА ПРОСТА ГОНАР ЗА НАШУ БЕЛАРУСЬ»

Першымі ў новым годзе на экскурсію ў Палац Незалежнасці трапілі медработнікі

Першая экскурсія ў Палацы Незалежнасці ў 2025 годзе прайшла 9 студзеня. Такі падарунак папрасілі ў кіраўніка дзяржавы работнікі Мінскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы падчас яго візіту напярэдадні Новага года. Аляксандр Рыгоравіч з задавальненнем выканаў гэтае жаданне, і вось больш за 100 найлепшых супрацоўнікаў медустановы атрымалі магчымасць убачыць на свае вочы гэты ўнікальны будынак.

Адным з ініцыятараў такога падарунка для калектыву быў **галоўны ўрач Дзмітрый ЗАЙЦАЎ.** Па яго словах, гэтая падзея — яшчэ адно пацвярджэнне таго, што мары спраўджваюцца.

— У гэтым годзе мы першыя наведвальнікі Палаца Незалежнасці. Большасць тут упершыню. Эмоцый шмат. Гэта проста гонар за наш суверэнітэт, за нашу незалежнасць і ўвогуле за нашу Беларусь, — падзяліўся ён.

Цэнтрам прыцягнення экскурсантаў стала ялінка ў кадцы, упрыгожаная чырвонымі сэрцайкамі. Аказалася, супрацоўнікі бальніцы самі падарылі яе Прэзідэнту. Як прайшла тая сустрэча, успомніла **загадчыца педыятрычнага аддзялення № 1 для лячэння дзяцей з кардыялагічнымі і рэўматалагічнымі захворваннямі Святлана КЛЯЧАН:**

— Кожны год мы традыцыйна віншуем са святам дзетак, якія застаюцца на лячэнні ў бальніцы на Новы год. Аднак заканчэнне 2024-га стала асаблівым, таму што да нас прыехаў сам Прэзідэнт.

Паводле яе слоў, як у медперсаналу, так і ў дзяцей уражанні проста цудоўныя.

— Вядома, перад візітам вельмі хвалюешся, бо разумееш, што чакаеш такога высокага госця. Аднак, як толькі Прэзідэнт звярнуўся да мяне, адразу стала лёгка на сэрцы. Было такое пачуццё, што гэта родны чалавек, якога я ведаю даўным-даўно і які проста прыехаў у госці павіншаваць дзяцей. У яго настолькі добрая аўра, што вам не перадаць. Гэта не толькі мае словы, але і словы дзяцей, якія прысутнічалі на святе. Яны нават пасля выпіскі тэлефануюць і ўспамінаюць той дзень, — распавяла Святлана Клячан.

Ідэя падарыць ялінку, якая цяпер упрыгожвае Палац Незалежнасці, кіраўніку дзяржавы была агульнай.

— Як і аддзяленне кардыялагічнае, мы ўпрыгожылі яе сэрцайкамі. Дзеткі напісалі на іх свае пажаданні. Атрымалася шчыра і з душой, — заключыла Святлана Клячан.

Дарэчы, гэта не першая яе сустрэча з Прэзідэнтам. Восем гадоў таму яна атрымлівала з рук Аляксандра Лукашэнкі медаль «За працоўныя заслугі».

Падзялілася сваімі ўражаннямі і **ўрач-атарыналарынголаг, старшыня прафсаюзнага камітэта Вольга ПАЧКОЎСКАЯ:**

— Я ведала, што тут будзе вельмі прыгожа, але не ўяўляла, што настолькі. Я шмат дзе была, і мне ёсць з чым параўнаць. Гэта ўнікальнае спалучэнне сучаснасці і манументальнасці, якое не можа пакінуць абыякавым.

Паводле яе слоў, жадаючых наведаць палац было вельмі шмат, аднак па распараджэнні галоўнага ўрача выбралі найлепшых з найлепшых — тых, хто добра праявіў сябе ў 2024 годзе, і тых, хто актыўна прымаў удзел у падрыхтоўцы да сустрэчы Прэзідэнта.

— Тут прысутнічаюць людзі абсалютна рознага сацыяльнага рангу. Тым не менш у палацы любы чалавек — ад простага санітара да галоўнага ўрача — можа адчуць сябе важным госцем. Для многіх гэтая экскурсія — як сапраўднае свята. Людзі хваляваліся, перапытвалі па некалькі разоў, а ці насамрэч іх узгадналі, а ці патрэбен зменны абутак, а якая форма адзення... Адным словам, для многіх — гэта падзея, — заключыла яна.

Экскурсія пакінула ў наведвальнікаў станоўчыя эмоцыі. Яны даведаліся шмат новага і цікавага, з задавальненнем разглядалі залы палаца і, канешне, рабілі фота на памяць.

Лізавета ГОЛАД,
фота аўтара.

Калі мы Палессе прывядзём у парадак, мы толькі за кошт Палесся накормім усю краіну. Палессе кінуць нельга.

Аляксандр Лукашэнка падчас рабочай паездкі ў Пінскі раён Брэсцкай вобласці пры наведванні ААТ «Парахонскае». 1 кастрычніка 2024 года.

Калі жыць і працаваць на зямлі прэстыжна

Узорам таго, як трэба працаваць на зямлі, назваў кіраўнік дзяржавы землі «Парахонскага», дзе дасягнуты высокі ўзровень гаспадарання і развіцця сацыяльнай сферы. «Чыста, прыгожа», — сказаў Прэзідэнт. І параіў іншым гаспадарнікам, чыноўнікам звяртацца ў «Парахонскае» па вопыт.

Гісторыя сельгаспрадпрыемства «Парахонскае» пачынаецца з першых калгасаў пасляваеннага часу. Але ж літаральна новае жыццё ў гэты край прынесла маштабная меліярацыя беларускага Палесся. У далёкім 1974 годзе меліяратары перадалі саўгасу «Парахонскі» першыя 2500 гектараў акультураных земляў былых балот. Гаспадарка пачала ўзводзіць жывёлагадоўчыя комплексы, цэхі па прыгатаванні кармоў, склады і іншыя гаспадарчыя памяшканні. Пасёлак тым часам прырастаў інфраструктурай. За паўстагоддзя «Парахонскае» перажывала розныя перыяды, былі ўзлёты і падзенні. Але, як бы цяжка ні было, у Парахонску не спынялася развіццё інфраструктуры. Напрыклад, у 2005 годзе ён стаў першым сельскім населеным пунктам краіны, дзе адкрылі спартыўную пляцоўку са штучным пакрыццём для заняткаў міні-футболам.

Асабліва дынамічна развівалася сельгаспрадпрыемства апошнія два дзесяцігоддзі. Тут пабудавалі і рэканструявалі шэраг сельскагаспадарчых аб'ектаў, узводзілі жыллё, паляпшалі інфраструктуру. У 2012 годзе была завершана газіфікацыя аграгарадка. Вялікая ўвага ўдзялялася падтрыманню ў парадку меліяраваных угоддзяў, добраўпарадкаваліся вуліцы і дарогі ўнутры гаспадаркі.

Сёння ААТ «Парахонскае» мае каля 26 тысяч гектараў сельгасугоддзяў, 26 тысяч галоў буйной рагатай жывёлы. Дарэчы, удой на адну карову па выніках года перавысіў адзнаку ў 10 870 кілаграмаў. Цэх механізацыі складаюць больш за 140 трактараў, 35 камбайнаў, 110 грузавых, 32 легкавыя аўтамабілі, 17 аўтобусаў.

У складзе гаспадаркі — шэсць малочнатаварных комплексаў, комплекс па дарошчванні і адкорме маладняку буйной рагатай жывёлы, які складаецца з пяці аддзяленняў, і ферма па вырошчванні цялушак. Шэсць вытворчых участкаў адведзены пад раслінаводчую прадукцыю, ёсць уласныя цэхі па вытворчасці камбікармоў, перапрацоўцы алейных культур, сушцы і грануляванні травяністых кармоў, вытворчасці паліўных брыкетаў. У штаце «Парахонскага» працуе больш за 750 чалавек.

Летась, калі святкавалі 50-годдзе гаспадаркі, яе **дырэктар Уладзімір ХРАЛЕНКА** падкрэсліў, што цяперашнія вынікі роўна ўдвая перавышаюць тыя, што былі чвэрць стагоддзя таму: «І па надоях малака, і па валавым зборы зерня. Цяпер нават цяжка падлічыць, у колькі разоў мы паднялі свой патэнцыял у тэхніцы, у будынках і збудаваннях. Літаральна ва ўсім мы на некалькі парадкаў вышэй. З 2009 года мы рухаліся шпаркімі крокамі. Па-першае, была аграмадная падтрымка, па-другое, аграмаднае жаданне. Людзі працавалі на новай тэхніцы, атрымлівалі прыстойную зарплату і ўтрымлівалі свае сем'і. Жыць у Парахонску і працаваць у ААТ «Парахонскае» сёння прэстыжна. Працоўныя і культурныя традыцыі старэйшага пакалення працягвае моладзь, і гэта радуе».

Галіна ДУБІНА працуе галоўным бухгалтарам ААТ «Парахонскае» больш за 15 гадоў. Яна падкрэсліла, што гаспадарка выпускае 23 працэнты валавой прадукцыі раёна пры тым, што займае ўсяго 15 працэнтаў тэрыторыі:

— Умовамі жыцця наш аграгарадок нічым не адрозніваецца ад вялікага горада. У нас цалкам добраўпарадкаванае жыллё, прыгожыя, сучасныя вуліцы. Дзеці маюць магчымасць займацца спортам, музыкай, творчасцю розных кірункаў, для гэтага ёсць усе ўмовы.

У вёсцы цудоўна арганізавана гандлёвае абслугоўванне, нават з горада людзі закупляюцца ў нашых крамах. Ну, а што такое прыстойная зарплата, думаю, не варта расказваць. Яна азначае найперш, што працаўнікі могуць спакойна аплачваць крэдыты, вучыць дзяцей, дазваляць сабе паездкі на адпачынак. У нас ёсць уся патрэбная інфраструктура: школы, садкі, участковая бальніца. Моладзь ад нас не збягае ў горад. Кажу гэта на прыкладзе сваёй сям'і. Усе тры мае сыны скончылі ВНУ сельскагаспадарчага профілю і вярнуліся на работу ў сваю гаспадарку. Маладыя маюць перспектыву як у забеспячэнні жыллём, так і ў прафесійным росце. Усе маладыя спецыялісты атрымліваюць кватэры. Гэтае жыллё даволі хутка вызваляецца, бо многія аддаюць перавагу будаўніцтву ўласнага дома, ды і гаспадарка ўзводзіць дамы.

Калі бачыш вынікі сваёй працы, яе сэнс, калі ёсць умовы для жыцця і работы, то ёсць настрой жыць і працаваць. Думаю, што менавіта ў тым кірунку, які мы асвойваем, і павінна развівацца сельскагаспадарчая галіна краіны. На першым месцы — паспяховая, эканамічна абгрунтаваная вытворчасць, за ёй ідзе абавязковае развіццё інфраструктуры. Калі гэта ёсць, то з'явіцца трэці складнік у выглядзе культурных праектаў, грамадзянскіх ініцыятыў. Гэта я назіраю як дэпутат сельскага Савета. Моладзі ў нас дастаткова, яна настаянна ініцыіруе экалагічныя, краязнаўчыя, іншыя акцыі і становіцца іх актыўным удзельнікам. Людзі ўсіх пакаленняў займаюцца спортам, удзельнічаюць у рабоце самадзейных калектываў, выязджаюць на канцэрты і прымаюць гасцей артыстаў.

У нас наогул бывае шмат гасцей. А цяпер іх колькасць расце яшчэ і за кошт калег, якія едуць у Парахонск на вопыт. Кожны месяц прымаем некалькі такіх дэлегацый.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь смуткуюць у сувязі са смерцю Артура Гарыевіча ЗЕЛЬСКАГА, намесніка дырэктара дзяржаўнай установы «Дзяржаўны мемарыяльны комплекс «Хатынь», і выказваюць глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.

КАНТЭКСТ

АБЯРЭГ АД «КРЫВОГА ЛЮСТЭРКА»

Што супрацьпаставіць фэйкам?

Электаральная кампанія па выбарах Прэзідэнта ў Беларусі няспынна рушыць да даты, якая наканавана стане стратэгічнай вяхой у гісторыі нашай краіны. Усё бліжэй 26 студзеня, калі кожны з нас зробіць свой выбар на карысць будучыні. Час урачысты і хвалюючы, без перабольшвання — момант ісціны. І не толькі ў філасофскім, а і ў жыццёвым сэнсе. Дзеля мірнай, стваральнай будучыні краіны, светлай перспектывы нашых дзяцей і ўнукаў. Няўжо нехта думае інакш? Будзем рэалістамі — электаральная кампанія выкарыстоўваецца нядобразычліўцамі як падстава для таго, каб пэўным чынам разгайдаць грамадства і перашкодзіць паступальнаму руху наперад нашай дзяржавы.

Рэчаіснасць усімі шляхамі імкнуцца сказіць — як у «крывым люстэрку». Глабальная сетка, быццам брудам, актыўна напаўняецца фэйкамі. Іх накіраванасць відавочная — зманіць людзей па лжывым шляху, прасцей кажучы, збіць з панталыку. Тады можна маніпуляваць, штурхаць у патрэбным кірунку. У ход ідуць высокія тэхналогіі, якія першапачаткова мелі менавіта стваральныя, а не разбуральныя мэты.

Адзін з апошніх прыкладаў — фальшывае відэа, створанае з дапамогай штучнага інэлекту, на якім прэс-сакратар кіраўніка дзяржавы Наталля Эйсмант выказваецца па «сірыйскім пытанні». Маўляў, мы не чакаем у сябе «палітычных выгнаннікаў» (маецца на ўвазе экс-прэзідэнт Сірыі Башар Асад) і падтрымліваем канструктыўныя ўзаемаадносіны з новымі ўладамі гэтай арабскай рэспублікі. Як падкрэслілі спецыялісты, гэтае відэа было згенерыравана з дапамогай штучнага інтэлекту.

Пры гэтым голас гучыць у абсалютным рассінхроне з выснамі спікера і ўважлівы глядач распазнае правакацыю. Як адзначыў Першы інфармацыйны тэлеканал, нельга выключаць той факт, што голас прэс-сакратара Прэзідэнта быў накладзены той жа праграмай, а таксама тымі ж спецыялістамі, якія былі задзейнічаны падчас інтэрв'ю Зяленскага амерыканскаму блогеру Лексу Фрыдману. Адметна, што напярэдадні Наталля Эйсмант пракаментавала РБК заяву з гэтага інтэрв'ю: «Ніякіх выбачэнняў Прэзідэнт Беларусі Зяленскаму не прыносіў, з той простай прычыны, што прасіць прабачэння нам няма за што».

Фэйкавае відэа было створана на аснове каментарыя Наталлі Эйсмант аб выніках нарады ў Прэзідэнта Беларусі 13 снежня, якая датычылася замежных візітаў. «Прэзідэнт сабраў сённяшнюю нараду, каб без найменшага прамаруджвання, літаральна імгненна, урад і іншыя службовыя асобы пачалі рэалізацыю тых дамоўленасцяў, якія былі дасягнуты ў ходзе праведзеных важных замежных перагавораў, — адзначыла, у прыватнасці, прэс-сакратар кіраўніка дзяржавы. — Камандзіроўка была вельмі насычаная і цяжкая. Інтэнсіўнасць сустрэч, перагавораў усе бачылі. «Ад Ціхага акіяна да Атлантыкі», — як сказаў кіраўнік дзяржавы».

Так што адчуйце розніцу — наколькі фальшыўка адрозніваецца ад арыгінала.

Тут, канешне ж, варта мець на ўвазе і сам змест, і кантэкст, і дэталі з'яўлення інфармацыйнага ўкіду. Усё ў комплексе. Важна разумець, што гэта — інфармацыйная атака, накіраваная на найбліжэйшае атачэнне Прэзідэнта. І ўсё надзвычай сур'ёзна. Нельга забываць пра ўрокі 2020-га, трэба быць надзвычай пільнымі.

А наконт абярэгу ад «крывога люстэрка» вельмі трапна выказаўся Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы ў МДЛУ са студэнтамі ВНУ гуманітарнага профілю Мінска ў фармаце «Адкрытага мікрафону». **«Калі хочаце ведаць праўду, чытайце і глядзіце дзяржаўныя сродкі масавай інфармацыі»**, — заўважыў Прэзідэнт і дадаў, што гэтым СМІ давярае больш за палову насельніцтва Беларусі. «Раней было не так. Людзі пераканаліся, дзе праўда. Таму перш за ўсё людзі давяраюць дзяржСМІ, — дадаў Аляксандр Лукашэнка. — І вам раю вельмі ўважліва да гэтага ставіцца. Я не гавару аб тым, што мы не павінны бачыць іншыя, альтэрнатыўныя пункты гледжання. Трэба іх бачыць, калі вы ўмееце аналізаваць і рабіць адпаведныя высновы. У гэтую інфармацыйную вайну вы павінны быць вельмі ўважлівыя, асцярожныя, акуратныя, павінны разбірацца. І ў гэтым плане грамадству павінны дапамагчы журналісты».

І вельмі важная згуртаванасць грамадства. **«Як бы хто ні імкнуўся нас сёння расхістаць — нічога не атрымаецца,** — заявіў Прэзідэнт Беларусі на цырымоніі ўручэння прэмій «За духоўнае адраджэнне», спецыяльных прэмій дзеячам культуры і мастацтва і спецыяльных прэмій «Беларускі спартыўны Алімп» 2024 года. — Мы зберажом сваю краіну. Яна ўжо належыць нашым дзецям і ўнукам. Таму нам варта падумаць аб іх будучыні. І мы думаем».

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

ПЕНСІЁННЫЯ НАВАЦЫІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Спецыяліст звярнула ўвагу, што павышаная пенсія будзе выплачана ўжо ў студзені. Інфармацыю наконт індывідуальнага каэфіцыента заробку можна ўдакладніць ва ўпраўленні сацыяльнай абароны, таксама яна маецца ў пенсіённых пасведчаннях грамадзян.

Пераразлік пенсій працоўным пенсіянерам праведзены ў аўтаматычным рэжыме, дадаткова звяртацца ў органы па працы і сацыяльнай абароне з гэтай прычыны няма неабходнасці.

Так, 900-годдзе з дня свайго заснавання адсвяткуе сёлета Полацкі Спаса-Ефрасіннеўскі жаночы манастыр, 800-годдзе – Свята-Елісееўскі Лаўрышаўскі мужчынскі манастыр, 100-годдзе – Пінская епархія. 555 гадоў споўніцца іконе Жыровіцкай Божай Маці і 505 гадоў – самому Жыровіцкаму манастыру, адзначыў **намеснік Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Сяргей ГЕРАСІМЕНЯ**. Таксама 125 гадоў спаўняецца Гродзенскай епархіі і 1020 гадоў – Тураўскай епархіі.

– Мы чакаем, што насычаным будзе не толькі месяц рэлігійнага турызму, але і ўвесь 2025 год, – падкрэсліў Сяргей Герасіменя.

У сувязі з гэтым Мінспорту разлічвае на супрацоўніцтва суб'ектаў розных відаў турызму: ад рэлігійных аб'ектаў да аграсядзіб і прадпрыемстваў грамадскага харчавання.

– Рэлігійны турызм – гэта ўзаемадзеянне паміж сабой усіх зацікаўленых бакоў: пачынаючы ад мясцовых органаў улады і заканчваючы лагістыкай і інфармацыйным забеспячэннем, – падкрэсліў намеснік Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў. – У развіцці рэлігійнага турызму важную ролю адыгрывае стварэнне неабходнай інфраструктуры.

СВЯТАЯ БЕЛАРУСКАЯ ЗЯМЛЯ

А глеба для гэтага папулярнага сёння ў свеце напрамку турызму ў нашай краіне выключна выдатная, перакананы спецыялісты. На працягу гісторыі Беларусь была месцам мірнага суседства розных канфесій і рэлігійных традыцый. У нашай краіне каля 1400 рэлігійных аб'ектаў па праве лічацца жамчужынамі папулярных турыстычных маршрутаў. Лідзіруюць па гэтым паказчыку Брэсцкая (каля 400 аб'ектаў), Гродзенская (460 аб'ектаў) і Мінская вобласці (123 аб'екты).

– Рэлігійны турызм развіваецца па двух напрамках, – адзначыла **кансультант аддзела планавання і арганізацыі турыстычнай дзейнасці Дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь Дар'я ШЫБЕКА**. – Гэта паломніцтва і экскурсіённа-пазнавальны турызм. І каля 85 % ад усіх распрацаваных сёння турыстычных маршрутаў уключаюць у той ці іншай ступені аб'екты рэлігійныя. Гэта найбольш інтэграваны від турызму, які гарманічна спалучаецца і з гісторыка-культурным турызмам, і з турызмам падзейным.

У нашай краіне рэстаўрыруюцца і аднаўляюцца старадаўнія помнікі рэлігійнай культуры, распавёў Сяргей Герасіменя. Такімі ўнікальнымі культавымі аб'ектамі, якія маюць велізарную гісторыка-культурную каштоўнасць, беларуская зямля багатая, і ў асноўным гэтыя храмы – дзейныя. З'яўляюцца і новыя рэлігійныя аб'екты, якія ўпрыгожваюць краіну і прыцягваюць паломнікаў розных рэлігій.

– Сёння ў Беларусі пабудаваны 2071 культавы аб'ект, яшчэ 184 будуецца. Нам важна «данесці» гэтыя аб'екты да спажыўца турыстычных паслуг. Толькі ў Мінску ў 2024 годзе можна назваць і Саборную мячэць, і храм Армянскай Апостальскай царквы, і ўсім вядомы Усіхсвяцкі храм, – пералічыў ён.

У мінулым годзе шэраг рэлігійных аб'ектаў быў уведзены ў гаспадарчы абарот, і ў найбліжэйшы час яны будуць уключаны ў турыстычны абарот, адзначыла Дар'я Шыбека. Яскравы прыклад: у канцы 2024 года расчыніла дзверы Валожынская іешыва, адзначыла спецыяліст. Храм (а дакладней, вышэйшая талмудысцкая школа) мае найцікавейшую музейную экспазіцыю, прастору для правядзення выставак, канферэнцый і брыфінгаў, а таксама невялікую гасцініцу непасрэдна ў будынку. Гэта гатовы турыстычны аб'ект, які тураператары могуць далучаць у свае маршруты.

АДКАЗЫ ЗНАЙСЦІ РАЗАМ

У новым 2025 годзе турыстычная сфера нашай краіны працягвае традыцыю прысвячаць кожны месяц пэўнаму віду турызму, адзначыла Дар'я Шыбека. Але ў параўнанні з мінулым годам была праведзена ракіроўка: месяц рэлігійнага турызму перамясцілі з кастрычніка на студзень. Гэта звязана з вялікай колькасцю рэлігійных свят напачатку года і, адпаведна, з фестывалямі, кірмашамі, відовішчамі. І, вядома, са святочнымі богаслужэннямі, бо рэлігійны турызм – гэта перш за ўсё паломніцтва, мэта якога – дотык да духоўнай рэальнасці праз фізічнае, канкрэтнае месца. Гэтай мэце дапамогуць мерапрыемствы, што запланаваны на студзень: ад семінараў і круглых сталоў да тураў і экскурсій. У ліку самых папулярных рэлігійных аб'ектаў у паломнікаў (як, зрэшты, і проста ў турыстаў) – Сафійскі сабор у Полацку, Барысаглебская (Каложская) царква ў Гродне, старадаўнія храмы ў вёсцы Камаі (Пастаўскі раён), вёсцы Мураванка (Шчучынскі раён), вёсцы Сынкавічы (Зэльвенскі раён), драўляныя цэрквы Палесся.

– Храм-крэпасць у Сынкавічах – сапраўды ўнікальны, – **падкрэсліў протаіерэй Арсеній АНАНКА, настаяцель храма Архангела Міхаіла**. – З ім звязана шмат загадак, на якія пакуль не знойдзены адказы. Магчыма, мы знойдзем іх дзякуючы рэлігійна-турыстычнай праграме. Людзі прыязджаюць у гэты храм з розных куткоў Зямлі, з многіх краін свету. Радуе, што ён сёння на слыху. Аўтобусы туды не ходзяць, і трэба здзейсніць свайго роду подзвіг, каб дабрацца да яго. Але людзі знаходзяць дарогу.

За апошнія гады ў Свята-Елісавецінскім жаночым манастыры пабывалі турысты і паломнікі не толькі з суседняй Расіі, але і з Бельгіі, Ірландыі, Марока, Шры-Ланкі, Францыі, Нігерыі, іншых краін, адзначыў **супрацоўнік паломніцкай службы манастыра Уладзімір ЧУРБАКОЎ**. А **ксёндз Андрэй РЫЛКО, настаяцель кафедральнага касцёла Узнясення Найсвяцейшай Панны Марыі ў Пінску**, распавёў, што толькі на канцэртах арганнай музыкі (ва ўнікальным касцёле захаваўся старадаўні арган, які налічвае паўтары тысячы труб) пабывала каля 80 тысяч чалавек, і гэта акрамя экскурсійных груп і паломнікаў. Развіццё рэлігійнага турызму ў Беларусі дае магчымасць усім ахвотным дакрануцца да вялікай духоўнай спадчыны, якая з'яўляецца здабыткам нашага народа, рэзюмаваў святар.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

«ВУЧЫЦЦА І РАЗАМ СТВАРАЦЬ»

Аб'яднаць адным конкурсам тысячы людзей, адарваць моладзь ад гаджэтаў, запусціць прарыўны праект — для многіх гэта немагчыма. Але для Прэзідэнцкага спартыўнага клуба — прывычныя рэчы. У яго актыве некалькі дзясяткаў праектаў, у якіх удзельнічаюць тысячы людзей. Толькі ў 2024 годзе ў рамках праекта «Спорт для ўсіх» у 41 населеным пункце з'явіліся сучасныя шматпрофільныя спартыўныя пляцоўкі. У мінулым месяцы быў прэзентаваны першы ў Беларусі падручнік па спартыўным праве. Спіс стыпендыятаў Прэзідэнцкага спартыўнага клуба — яны радуюць сваімі поспехамі на міжнародных стартах. Усё гэта красамоўнае пацвярджэнне таго, што Беларусь — сапраўды спартыўная дзяржава. Як удаецца аб'яднаць беларусаў любоўю да спорту і якія новыя і традыцыйныя сродкі патрэбны для гэтага, разбіраліся з памочнікам старшыні Прэзідэнцкага спартыўнага клуба Паўлам ЯГОРАВЫМ.

— 2024-ы выдаўся насычаным на праекты і мерапрыемствы. Які галоўны вынік дзейнасці Прэзідэнцкага спартыўнага клуба?

— У гэтым сезоне мы не ініцыіравалі новых праектаў, але аптымізавалі тыя, што ёсць. Адной з ключавых мэт на 2024-ы было ўдасканаленне работы ў сацыяльных сетках. Мы пачалі актыўна прымяняць новыя, нестандартныя формы асвятлення мерапрыемстваў. Натуральна, без СМІ нам не абысціся, і я хачу падзякаваць ім за ўвагу. Але ў той жа час мы выкарыстоўваем і альтэрнатыўныя крыніцы, сацыяльныя сеткі, працуем над прыцягненнем блогераў, інфлюенсераў, медыйных асоб. Падобны падыход упершыню выкарысталі на пляцоўцы «Спорт для ўсіх» у рамках Мінскага паўмарафону. Людзі гэта ўспрынялі на «ўра». Асабліва прыемна, што блогеры самі зацікаўлены ў супрацоўніцтве, прапаноўваюць свежыя ідэі і падыходы.

Адкрыццё пляцоўкі «Спорт для ўсіх» са старшынёй Прэзідэнцкага спартыўнага клуба Дзмітрыем ЛУКАШЭНКАМ.

— У акаўнта Прэзідэнцкага спартыўнага клуба ў Instagram 18 тысяч падпісчыкаў. Зразумела, што аўдыторыя розная. Як знаходзіць падыход да кожнага?

— Актыўнасць Прэзідэнцкага спартыўнага клуба, як вядома, вельмі разнастайная. Нехта ўдзельнічае ў нашых праектах, нехта проста назірае. Мы традыцыйна атрымліваем зваротную сувязь ад удзельнікаў, але нам цікава пагутарыць і з назіральнікамі, пачуць іх заўвагі і прапановы. Магу сказаць, што да назіральнікаў мы таксама дастукаліся. Паказчыкам стаў праект «Дацягніся да мары» — першы, які мы запусцілі ў сацыяльных сетках. Мы паставілі перад сабой цікавую задачу — выкарыстоўваць сацыяльныя сеткі, каб актывізаваць моладзь. Правілы абсалютна простыя: падцягнуцца максімальную колькасць разоў, выкласці відэа з хэштэгам у Instagram і атрымаць каштоўны прыз. Ужо ў першым сезоне мы бачылі большую актыўнасць сярод дзяцей і падлеткаў. Але і дарослыя хацелі паўдзельнічаць. У другім сезоне пашырылі ўзроставыя катэгорыі. Для мяне асабіста было шокам, што адзін з пераможцаў падцягнуўся 130 разоў. Але, мабыць, самае галоўнае, што гэты праект, як і іншыя ў сацыяльных сетках, змяніў рэальнае жыццё ўдзельнікаў. Адзін з пераможцаў, хлопец з раённага цэнтра, настолькі задаўся мэтай выйграць прыз, што склаў сабе расклад на дзень і ўсё рабіў у адпаведнасці з графікам. Дзякуючы гэтаму ён яшчэ і вучобу падцягнуў. У адзін з сезонаў конкурсу «Суперлібера» ў розных узроставых катэгорыях перамаглі маці і сын. Яны разам трэніраваліся, здымалі відэа. У выніку сям'я не толькі стала больш часу праводзіць разам — хлопец трапіў у валейбольную каманду «Мінск» і ўдзельнічае ў дзіцячай лізе «Мяч над сеткай», нашым сумесным з федэрацыяй валейбола праекце.

— Сёння вельмі папулярнае тэлевізійнае шоу «Героі», пераможца прэміі «Тэлевяршыня». У чым вы бачыце звышзадачу гэтага праекта?

— Праект «Героі» — гэта праца вялізнай каманды людзей, якія любяць сваю справу. Кіраўніцтва Прэзідэнцкага спартыўнага клуба і Белтэлерадыёкампаніі абмяркоўвалі ідэю такога праекта яшчэ ў 2018 годзе. Тады лунала думка аб адраджэнні «Спартландыі», але выразнага разумення, у якім фармаце яе адраджаць, не было. І калі да нас звярнуліся супрацоўнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях з просьбай падтрымаць спаборніцтвы па пажарна-ратавальным спорце, мы зразумелі, што вось яны, смелыя, адважныя героі, пра якіх варта расказваць. І ўсё закруцілася. Першы сезон «Герояў» — шоу для беларускіх дзяцей. У другім сезоне яно стала міжнародным, у ім пачалі ўдзельнічаць беларускія селебрыці. Трэці сезон застаўся міжнародным дзіцячым шоу, а таксама мы далі магчымасць паўдзельнічаць любому беларусу. На кастынг прыйшло некалькі соцень людзей, якія жадаюць выйсці з зоны камфорту і кінуць сабе выклік. Дзякуючы гэтаму праекту, мы бачым і паказваем гледачам, як шмат у нашай краіне смелых, актыўных людзей, сапраўдных герояў. Мы ўжо бачым цікавасць з іншых краін. Таму, магчыма, у чацвёртым сезоне будуць удзельнічаць прадстаўнікі мінімум трох кантынентаў. Мабыць, вось звышзадача — аб'яднаць актыўных людзей як на здымках шоу, так і па той бок экрана.

— І ўсё ж галоўная мэта дзейнасці Прэзідэнцкага спартыўнага клуба — папулярызацыя спорту, павелічэнне масавасці або пошук будучых прафесійных спартсменаў?

— Знайсці здольных дзяцей, зацікавіць іх, каб у будучыні атрымаць прафесійных спартсменаў — гэта не проста мэта Прэзідэнцкага спартыўнага клуба, гэта наша стратэгія, дарожная карта. Усе турніры таму мы праводзім на найвышэйшым узроўні. Усе фіналы праходзяць у Мінску не проста так. Тут сканцэнтраваны найлепшыя трэнеры, у арганізацыі спаборніцтваў удзельнічаюць спецыялісты федэрацый па відах спорту. Напрыклад, фінал дзіцячаюнацкай валейбольнай лігі «Мяч над сеткай» або спаборніцтваў «Імклівы мяч» праходзяць на базе Рэспубліканскага дзяржаўнага вучылішча алімпійскага рэзерву. З трыбун на дзяцей глядзяць найлепшыя трэнеры па рабоце з рэзервам. Па выніках гэтага сезона «Імклівага мяча» на прагляд у вучылішча алімпійскага рэзерву было запрошана 80 чалавек.

— Сёлета Прэзідэнцкаму спартыўнаму клубу спаўняецца 20 гадоў. Вы працуеце ў клубе 15 гадоў. Як захоўваць любоў да сваёй справы?

— Гэта найлепшая работа ў свеце. Яна дае магчымасць увесь час развівацца, тут няма ніякай руціны. І вялікі дзякуй кіраўніцтву за магчымасць эксперыментаваць і адкрываць новае. Хачу падзякаваць нашым партнёрам — Міністэрству спорту і турызму, Міністэрству адукацыі, Нацыянальнаму алімпійскаму камітэту, федэрацыям па відах спорту — усім, з кім мы рэалізоўваем разнастайныя праекты. Гэта тысячы людзей, якія аддана любяць спорт, сваю справу. І вельмі крута знаходзіцца сярод іх, вучыцца і разам ствараць.

Валерыя СЦЯЦКО.
Фота Прэзідэнцкага спартыўнага клуба.

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «МГЦН» **29 января 2025 года** в рамках **387-го открытого аукциона** по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности (далее – имущество) проводит аукцион по продаже права заключения договора аренды с правом выкупа капитального строения (далее – аукцион)

№ предмета аукциона	Арендодатель имущества	Местонахождение имущества	Площадь (кв. м)	Размер коэффициента спроса к базовой ставке арендной платы (от 0,3 до 3) или размер арендной платы в БАВ	Начальная цена права заключения договора аренды имущества/ сумма задатка (руб.)	Наименование и целевое использование имущества, срок аренды
49	УП «Минское отделение Белорусской железной дороги» Минская дистанция гражданских сооружений, тел. +37517 225 66 22	Минская область, Минский район, 44/1, ст. Ратомка	441,30	3	1175,62	Здание склада под складские и производственные цели. Год постройки – 1958 г. По техническому паспорту: фундамент – бетон, стены – кирпич, полы – бетон оконные проемы – деревянные. Водоснабжение и водоотведение отсутствует, электроснабжение – централизованное. **Срок аренды с правом выкупа – 1 год.***

* **Договор аренды заключается с правом выкупа. Рыночная стоимость объекта составляет 206 000,00 (двести шесть тысяч) белорусских рублей, без учета НДС (20 %).** Цена продажи недвижимого имущества не включает цену земельного участка (цену права заключения договора аренды земельного участка), необходимого для его обслуживания. Право подписания и подачи заявления о государственной регистрации договора купли-продажи и основанных на нем прав предоставляется Арендатору. Расходы по государственной регистрации договора купли-продажи и основанных на нем прав возлагаются на Арендатора. Арендатор обязан письменно обратиться к Арендодателю и подтвердить свое намерение о выкупе Объекта за 2 месяца до истечения срока действия договора. Договор вступает в силу с момента подписания обеими сторонами настоящего договора и действует в течение одного года с даты заключения договора аренды с правом выкупа. В случае если Арендатор желает воспользоваться правом на выкуп имущества, он обязан обратиться к Арендодателю не менее чем за два месяца до истечения настоящего договора. Договор купли-продажи имущества заключается не менее чем за один месяц до истечения срока действия договора аренды с правом выкупа. Срок вступления в силу договора купли-продажи на следующий день после истечения срока действия договора аренды. В случае отказа арендатора от выкупа недвижимого имущества договор аренды с правом выкупа этого недвижимого имущества по истечении срока действия считается расторгнутым

Организатор аукциона – государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 10, тел. +375 (17) 360 42 22.
Аукцион состоится **29 января 2025 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов). Прием документов и консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 08 января 2025 г. по 23 января 2025 г. включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. Расчетный счет для перечисления задатка: BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, кодификатор назначения платежа – 40901, назначение платежа – **задаток для участия в аукционе № 387 от 29.01.2025 по предмету аукциона № 49.**
Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах изложен в извещении о проведении аукциона, размещенном на интернет-сайтах: организатора аукциона – **www.mgcn.by** (раздел «Недвижимость в аренду», «Недвижимость в собственность»); Минского городского исполнительного комитета – **www.minsk.gov.by** (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА»); Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – **www.gki.gov.by** (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА ИМУЩЕСТВА»). Телефон для справок **+375 (17) 360 42 22**

РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) извещает о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **ООО «Гермес-снаб»** (Продавец).

Электронные торги состоятся 11.02.2025 в 10.00.

Лот № 1:

Изолированное помещение с инв. № 700/D-158000.

Общая площадь (кв. м): 435,0. Год постройки – 2021.
Местонахождение:
Могилевская обл., г. Могилев, ул. Лазаренко, 63-69.
Начальная цена с НДС 20 % – 598 000,00 руб.
Задаток – 59 800,00 руб.
Шаг электронных торгов – 5 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).

Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X.
Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.
Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **06.02.2025 в 16.00.**

Организатор электронных торгов:
☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52; torgi@ino.by
Электронный адрес ЭТП: gostorg.by

УНП 190055182

НА ВЫСТАЎКУ — У КІНО

Фільм пра Полацкі Спаса-Ефрасіннеўскі манастыр паказалі на выстаўцы «Мая Беларусь». І гэта не адзіны кінапаказ

Сяргей ЛАЛАЗАРАЎ, навуковы кіраўнік рэстаўрацыйных работ у Спаса-Праабражэнскім храме Полацкага Спаса-Ефрасіннеўскага жаночага манастыра, — адзін з герояў дакументальнага фільма.

У жыхароў Мінска і гасцей Беларусі з'явілася яшчэ адна абавязковая для наведвання славутасць — Мінскі міжнародны выставачны цэнтр, які адкрыўся на вуліцы Паўліны Мядзёлкі. Там адбываюцца не толькі выстаўкі — дзякуючы інавацыйным тэхналогіям у цэнтры можна правесці мерапрыемства любога фармату і маштабу. Ёсць магчымасць і для дэманстрацыі кінастужак. Таму ў межах выстаўкі дасягненняў суверэннай Беларусі «Мая Беларусь» адбываюцца паказы Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм».

Праграма 7 студзеня, на праваслаўнае свята Раждаства Хрыстова, стала адмысловай — дакументальныя стужкі пра слу-

жэнне Беларускай праваслаўнай царквы. Сярод іх — фільм, зняты на студыі «Летапіс», кінастудыі «Беларусьфільм» «Абіцель святой Ефрасінні». Яго прадставіў аўдыторыі рэжысёр Уладзімір Луцкі, лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва, а таксама шматлікіх кінаконкурсаў. Прэм'ера фільма пра славуты полацкі манастыр адбылася падчас Мінскага міжнароднага кінафестывалю «Лістапад», што прайшоў напрыканцы мінулага года. Выбар тэмы невыпадковы — сёлета адзначаецца 900-

годдзе Полацкага Спаса-Ефрасіннеўскага праваслаўнага жаночага манастыра, аднаго з найстарэйшых цэнтраў хрысціянства на нашай зямлі. Сюжэт фільма заснаваны на «Жыціі» Ефрасінні Полацкай, заснавальніцы манастыра. Глядач можа не толькі паглыбіцца ў беларускую гісторыю, але і далучыцца да сённяшняга жыцця абіцелі святой Ефрасінні, паслухаць расповеды экспертаў пра таямніцы старажытных фрэсак, пра цуды, якія адбываюцца каля мошчаў прападобнай Ефрасінні, папрысутнічаць на начной службе і зазірнуць на заняткі ў нядзельную школу.

Уваход на ўсе сеансы вольны.

— Гэта вельмі знакава і адказна, што фільм быў паказаны ў дзень светлага свята Раждаства Хрыстова, — кажа рэжысёр Уладзімір Луцкі. — Адзначу выдатныя тэхнічныя магчымасці і ўмовы, прадстаўленыя Мінскім міжнародным выставачным цэнтрам: ад добрай карцінкі і гуку да ўтульных крэслаў залы. Цешыць, што прысутнічала шмат дзяцей. На паказы бясплатна прыходзяць усе ахвотныя. Прыемна было пачуць водгукі гледачоў, якіх уразіла ўбачанае. Пасля каляднага паказу ў цэнтры стужка «Абіцель святой Ефрасінні» адправіцца на экраны кінатэатраў краіны. Ну і, зразумела, адыграе сваю ролю ў святкаванні юбілею старажытнага манастыра.

У гэты святочны дзень былі паказаны і іншыя стужкі, прысвечаныя служэнню Беларускай праваслаўнай царквы. Фільм «Беларусь. Здабыццё веры», зняты ў 2023 годзе, прадставілі кіраўнік здымачнай групы Інга Бялова і намеснік старшыні Сінадальнага інфармацыйнага аддзела Беларускай праваслаўнай царквы Алег Лепешанкоў. Пра трохсерыйны дакументальны фільм «За паству і Айчыну» аб подзвігу святароў у часы Вялікай Айчыннай вайны гледачам распавяла аўтар, журналіст Белтэлерадыёкампаніі Алена Борматава. Фільм быў зняты творчай групай агенцтва тэленавін Белтэлерадыёкампаніі пры садзейнічанні Камітэта дзяржаўнай бяспекі.

Што датычыцца праграмы «Беларусьфільма» на выстаўцы «Мая Беларусь», яна досыць разнастайная і прымеркавана да магістральных тэм. 11 студзеня будзе паказана кінатрылогія да 100-годдзя беларускага кіно, 12-га ў праграме «Час герояў» усе ахвотныя змогуць паглядзець стужкі «Мара чэмпіёна» і «Птушка фенікс Аляксея Талая». На 1 і 2 лютага запланаваны паказ стужак на тэму «Насустрач 80-годдзю Вялікай Перамогі», праграма 8 і 9 лютага адрасавана дзецям і аматарам камедый. А з 11 лютага штодня на працягу тыдня — дэманстрацыя анімацыйнага фэнтэзі па матывах славянскай міфалогіі «Песня Сірын». Уваход на ўсе сеансы вольны.

Людміла ІВАНОВА.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА
СО СНИЖЕНИЕМ ЦЕНЫ НА 80 %

Организатор аукциона: ЗАО «Оценка Сервис», 246015, г. Гомель, ул. Лепешинского,1
Продавец: Добрушское РАЙПО, 247070, г. п. Тереховка, ул. Вокзальная, 47,
в лице ликвидатора Беланова Р.Н., тел. +375 (232) 34-98-92.
Торги состоятся 23 января 2025 года в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Ирининская, 6Б, 2-й этаж, каб. 28.

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, без НДС (20 %), бел. руб.	Сумма задатка, без НДС (20 %), бел. руб.
1	**Капитальное строение с инв. № 311/С-52016** площадью **189,5 кв. м,** назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – **магазин № 35.** Адрес: Гомельская обл., Добрушский р-н, Утевский с/с, д. Гордуны, Магазин № 35. **Информация о земельном участке:** расположен на земельном участке с кадастровым номером **321287200601000087** общей площадью **0,0620 га.** Право постоянного пользования. Доля в праве 1/1. **Местоположение (адрес):** Гомельская обл., Добрушский р-н, Утевский с/с, д. Гордуны. **Целевое назначение земельного участка:** для обслуживания магазина. **В состав лота входят:** пристенные стеллажи – 13 шт. (инв. № 1698/825), витрина холодильная Brimstone (инв. № 410/3610), ларь морозильный (инв. № 411-3611), стол торговый – 6 шт. (инв. № б/н), стеллаж металлический (3*2,5) 3 шт. (инв. № 1453/485), котел (инв. № 1925/503)	**6 622,00**	**662,20**

Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел. 8 (044) 590-84-01, Кондратенко Валентина Александровна.
Шаг аукционных торгов – 5 (пять)% от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона.
Для участия в аукционе необходимо:
1. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ЗАО «Оценка Сервис»):** BY94 BPSB 3012 3353 2001 9933 0000, в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 491382947, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № 1 **(задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления)**. Код назначения платежа – 40901 «Перечисление гарантийного взноса».
2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 10 января 2025 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Ирининская, 6Б, 2-й этаж, каб. 28 в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.
Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 21 января 2025 г. в 16.00 включительно.
Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения. **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того**, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату услуг (вознаграждение) по организации и проведению торгов, возместить затраты по газете в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи не позднее **10 (десяти) рабочих дней** со дня проведения торгов; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи не позднее **30 (тридцати) календарных дней** со дня проведения торгов.
Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 05.09.2024 г. № 173 (30307).
Проводится аукцион в соответствии с «Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 (в ред. постановления Совмина от 12.07.2013 № 607).
Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: (тел./факс) 8 (0232) 51-22-17, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 694-43-89.
E-mail: ocenkaservis.gomel.by@mail.ru

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
извещает о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего
ОАО «Премьерлизинг» (Продавец)

Электронные торги состоятся 21.01.2025.

Лот № 1: Помещение универсама
с инв. № 200/D-168410, площадь – 1935,9 кв. м.

Адрес: Витебская обл., г. Витебск, ул. Правды, 64А-1.
Земельный участок № 240100000001006088, 0,4013 га.
Право постоянного пользования.
Обременения: Аренда, Ипотека, Сервитут.

Подписание договора купли-продажи и его регистрация возможны только при условии получения согласия залогодержателя по договору об ипотеке.
Организатор электронных торгов и Продавец не несут ответственности за незаключение договора купли-продажи с Победителем электронных торгов (Претендентом на покупку) по причине, вызванной обстоятельствами, изложенными выше.

Начальная цена с НДС 20 % – 2 167 376,40 долларов США.
Задаток – 757 606,42 руб.
Шаг электронных торгов – 2 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).
Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.
Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.
Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **16.01.2025 в 16.00.**

Организатор электронных торгов:
☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52;
torgi@ino.by
Электронный адрес ЭТП: gostorg.by

УНП 190055182

НАДВОР'Е

МАРОЗ І ЗАВІРУХА

Другая дэкада студзеня пачынаецца са слабых завей, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Праўда, у пятніцу будзе яшчэ дажджліва. У гэты дзень у Беларусі надвор'е вызначаць атмасферныя франты ад цыклону з цэнтрам над краінамі Балтыі. Чакаецца пераважна воблачнае надвор'я. На большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. У начныя і ранішнія гадзіны месцамі прагназуюцца слабыя туман і галалёд, на асобных участках дарог галалёдзіца. Вецер паўднёвы, паўднёва-заходні парывісты, раніцай і днём месцамі па захадзе краіны моцны парывісты. Тэмпература паветра ўначы ад мінус аднаго да плюс пяці градусаў, а максімальная днём 3–9 цяпла. Атмасферны ціск ноччу будзе падаць, днём істотна не зменіцца.

А далей, не вельмі спяшаючыся, прыйдзе сапраўдная зіма. У найбліжэйшыя два дні на тэрыторыю Беларусі чакаецца паступленне халодных паветраных мас паўночнаатлантычнага паходжання. Мы гэта адчуем ужо ў суботу. У гэты дзень будзе воблачна з праясненнямі. На большай частцы тэрыторыі краіны пройдзе снег, мокры снег. Месцамі чакаецца завіруха, на дарогах – галалёдзіца. Вецер парывісты, у асобных раёнах моцны парывісты. Тэмпература паветра на працягу сутак складзе ад 4 марозу да 2 цяпла.

А ў нядзелю стане яшчэ халадней. Будзе воблачна, ноччу з праясненнямі. На большай частцы тэрыторыі краіны пройдзе снег, мокры снег. Месцамі слабая мяцеліца, на дарогах галалёдзіца. Вецер пераменных напрамкаў парывісты. Тэмпература паветра ўначы 1–6 марозу, а максімальная днём ад мінус 4 градусаў да 1 цяпла.

Як адзначыла **начальнік аддзела вывучэння змяненняў клімату службы метэаралагічнага і кліматычнага маніторынгу, фонду даных Белгідрамета Вольга БАКЛАНАВА,** у снежні тэмпература паветра была вышэйшай за кліматычную норму на 2,8 градуса. Дагэтуль на большай частцы тэрыторыі краіны кліматычная зіма не наступіла. Такая сітуацыя назіралася і ў сезоне 2021 года.

Кліматычныя прагнозы на цёплы і халодны перыяды года для краін СНД складае Паўночна-Еўразійскі кліматычны цэнтр. «Па перададзеным нам прагнозе, які носіць кансультацыйны характар, гэты зімовы сезон у Беларусі чакаецца цяплейшы, чым звычайна, з верагоднасцю 60–75 %», – адзначыла спецыяліст.

А пакуль у выхадныя будзе марозна. Зімовы характар надвор'я захаваецца ў краіне і ў пачатку наступнага працоўнага тыдня.

Сяргей КУРКАЧ.

Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 213

Віншуем чытачоў са святамі, зычым здароўя, шчасця, поспехаў ва ўсіх справах! А наш чытач Міхаіл Кошаль з Мінска прапануе сваю новую задачу ў якасці навагодняга падарунка аматарам шахмат (гл. дыяграму).



Белыя: Крd7, Фа6, Лg1, Се4, Кb7, Кf6 (6).

Чорныя: Крe5, Кf7 (2).

Мат за 2 хады.

Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі (вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск, «Звязда») або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

Наступная задача Мікалая Быкава (Брэсцкая вобласць) заняла 11-е месца ў XXII камандным чэмпіянаце Расіі па складанні шахматных кампазіцый.

Белыя: Крh7, Фе8, Лf5, Сf6, Ка6, пп. b2, b5, c2, d4, d6 (10).

Чорныя: Крc4, Фе1, Лb7, Лс7, Cd2, Се2, пп. f7, g3, h4 (9).

Мат за 2 хады.

1. d5? ~ 2. b3х (2. Фе4+? Кр:b5!), 1...Л:b5 2. Фе4х, 1...Лс6 2. Ф:с6х, 1...Фb1 2. Ф:e2x, але 1...Лd7!; 1. Фе5? ~ 2. Фd5х, 1...Л:b5 2. Ф:b5х, 1...Лс5 2. Ф:c5x, але 1...Cf3! Рашае 1. Фе4! ~ 2. Фd5х (2. d5+? Кр:b5!), 1...Л:b5 2. d5х, 1...Лс5 2. Л:c5x, 1...Cf3 2. Фd3х, 1...Фh1 2. Ф:e2x.

* * *

Падведзены вынікі міжнароднага конкурсу складання шахматных задач памяці беларускага майстра Мікалая Іванавіча Бельчыкава (1947–2023). Конкурс праводзіўся спецыялізаваным выданнем «Альбіна» ў раздзелах двух- і трохходовых задач.

* * *

У беларускай сталіцы фінішавала першая ліга чэмпіянатаў краіны. У мужчынскім турніры сярод 99 гульцоў былі адзін міжнародны майстар і чатыры майстры FIDE. Перамог майстар FIDE Міхаіл Спіжарны – 7,5 бала з 9. Па 7 балаў набралі майстар FIDE Міхей Навуменка, Арцём Бяляўскі і Цімур Гвоздзеў. У жаночым турніры было 25 удзельніц: 1) Вікторыя Дорашава – 7,5 бала; 2) Марыя Баравікова – 7; 3) Мілена Сідарэня, 4) Вераніка Абрамкіна – па 6,5 бала. Усе згаданыя шахматысты і шахматысткі заваявалі пуцёўкі ў вышэйшую лігу. Мы яшчэ вернемся да гэтай тэмы.

* * *

У Сінгапуры, на востраве Сентоса, прайшоў матч за найвышэйшы шахматны тытул паміж чэмпіёнам свету Дзін Ліжэнем (Кітай, 1992 г. н.) і прэтэндэнтам Гукешам Дамараджу (Індыя, 2006 г. н.). Перамог Гукеш – 7,5:6,5. Ён стаў новым чэмпіёнам свету. Прызавы фонд складаў 2,5 мільёна долараў.

* * *

У Мінску прайшоў рэспубліканскі турнір ветэранаў (59 удзельнікаў). Перамог гросмайстар Андрэй Кавалёў – 7,5 бала з 9. Месцы з другога па чацвёртае (па 6,5 бала) занялі адпаведна міжнародныя майстры Валерый Смірноў і Пётр Карзубаў, Уладзімір Голубеў. Лепшы вынік сярод жанчын паказала гросмайстар Рахіль Эйдэльсон.

На чэмпіянаце Еўропы ў Чарнагорыі Уладзіслаў Кавалёў заняў 20-е месца з 388.

На дзіцячым чэмпіянаце свету ў Італіі (да 12 гадоў) Ніка Венская была восьмая сярод дзяўчынак, Дамір Булгак – дваццаты сярод хлопчыкаў. Ніка стала ў сваёй узроставай катэгорыі чэмпіёнкай свету па рашэнні шахматных задач.

У індыйскім Бхуханесвары (272 удзельнікі) Аляксей Фёдараў фінішыраваў пяты, а Яўген Падольчанка – дзявяты.

* * *

Задача з мінулага выпуску рашаецца: 1. de! Правільна адказалі Міхаіл Кошаль, Ігар Ананіч, Васіль Жуковіч, Віктар Жук, Васіль Барысевіч, Сяргей Цяльпук.

Вадзім ЖЫЛКО.

10 СТУДЗЕНЯ Даты Падзеі Людзі

У краіне

1569 год – у Люблінскім замку пачаўся сейм, на якім адбылося складанне уніі паміж Польскім Каралеўствам і Вялікім Княствам Літоўскім.

1930 год – нарадзіўся (в. Селівонаўка Маладзечанскага раёна) Фёдар Мікалаевіч Капуцкі, акадэмік НАН Беларусі, доктар хімічных навук, прафесар, заслужаны работнік вышэйшай школы Беларусі. У 1973–1985 гадах – намеснік, першы намеснік міністра вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР, у 1990–1996-м – рэктар Белдзяржуніверсітэта. Аўтар больш за 500 навуковых прац у галіне структурнай і хімічнай мадыфікацыі цэлюлозы і яе вытворных.

1972 год – у Вязынцы быў створаны Купалаўскі мемарыяльны запаведнік.

У свеце

49 год да н. э. – насуперак закону Гай Юлій Цэзар перасек са сваім войскам Рубікон і распачаў паход на Рым. Па законе праконсул, якім і з'яўляўся тады Юлій Цэзар, меў права ўзначальваць войска толькі за межамі Італіі. Таму, пераходзячы раку, ён не быў упэўнены ў сіле свайго атрада, у сувязі з чым вагаўся, бо ў выпадку няўдачы ён будзе падвергнуты публічнай ганьбе і смерці. Ён перайшоў праз Рубікон і пасля грамадзянскай вайны стаў імператарам.

1920 год – уступіў у сілу Статут Лігі нацый, міжнароднай арганізацыі, якая мела мэтай развіццё супрацоўніцтва паміж народамі і гарантыю міру і бяспекі, ратыфікаваны 42 краінамі. У гэты ж дзень на першым у гісторыі пасяджэнні Лігі нацый ратыфікаваны Версальскі дагавор, які скончыў Першую сусветную вайну.

1943 год – пачатак аперацыі войскаў Чырвонай Арміі «Кальцо», якая завяршыла Сталінградскую бітву.

1946 год – першае пасяджэнне Генеральнай Асамблеі ААН у Лондане, на якім была прадстаўлена 51 дзяржава.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27,

e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 382000000067 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 12 820. Індэкс 63850. Зак. № 77.

Нумар падпісаны ў 19.30

9 студзеня 2025 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12